# Адкрываць таленты



## IV Рэспубліканскі конкурс харэаграфічнага мастацтва “Час танцаваць” падвёў вынікі.

“Час танцаваць” — маштабны сацыяльна значны праект, арганізатарам якога з’яўляецца Рэспубліканскі культурна-асветны цэнтр Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. За 2022—2024 гады дзякуючы творчаму спаборніцтву аб сваім таленце заявіла больш за 2500 танцораў з 24 гарадоў Беларусі і замежжа. Сёлетні фінал, які праходзіў 5 красавіка ў канцэртнай зале “Мінск”, аб’яднаў каля 900 выканаўцаў з нашай краіны, Расіі, Кітая.

— Прыемна, што спаборніцтва сабрала прадстаўнікоў усіх беларускіх рэгіёнаў — як абласных цэнтраў, буйных гарадоў, так і маленькіх населеных пунктаў, аграгарадкоў, — адзначыў дырэктар РКАЦ **Аляксандр Сідарэнка**. — Цікавасць да конкурсу нязменна высокая: у параўнанні з 2024-м колькасць нумароў-фіналістаў павялічылася на 20.

Удзельнікі выступалі ў пяці намінацыях — класічны, сучасны, эстрадны, народны, бальны танец — і ў шасці ўзроставых катэгорыях.

— Узровень майстэрства выканаўцаў з кожным годам усё ўдасканальваецца — у тым ліку дзякуючы нашай адукацыйнай праграме. Практычныя і тэарэтычныя заняткі традыцыйна праводзім як для балетмайстраў, так і для канкурсантаў, — падкрэсліў Аляксандр Сідарэнка.

Прафесійнаму журы было няпроста вызначаць найлепшых. Пераможцамі ў намінацыях прызналі калектыў Stay dance project дзіцячай школы мастацтваў імя Анатоля Каплана з Рагачова (“Сучасны танец”), Лізавету Гербутаву, навучэнку Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа (“Класічны танец”), узорны ансамбль танца “Натхненне” (“Народны танец”) і калектыў RDC Roleva Dance Center (“Эстрадны танец”) з Мінска, узорную студыю бальнага спартыўнага танца “Феерыя-Dance” (“Бальны танец”) з Ліды.

Спецыяльныя прызы атрымалі ўзорны харэаграфічны ансамбль “Сюрпрыз” з Барнаула за ўвасабленне тэмы Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і народны ансамбль танца “Рэха” са Століна за захаванне і развіццё традыцый народнага танца.




Калектыў Stay dance project з кіраўніком Станіславам Грачко

Галоўную ўзнагароду ў памеры 200 базавых велічынь здабыў калектыў Stay dance project з нумарам “Дарога ў Азарычы” ў намінацыі “Сучасны танец”. Кіраўніку гэтага ансамбля — **Станіславу Грачко** — уручылі прыз за найлепшую балетмайстарскую работу.

— Да выступлення выхаванцы падышлі вельмі адказна, імкнуліся ў поўнай меры адлюстраваць увесь боль вайны праз харэаграфію, — адзначыў педагог. — Танец — гэта не толькі рухі, спаборніцтва на хуткасць і пластычнасць, але і яркія пачуцці, эмоцыі і нават цэлая гісторыя.

Пяты конкурс “Час танцаваць”, як заявіў Аляксандр Сідарэнка, абяцае быць не менш яркім, гучным, насычаным і шчодрым на прызы — усё на карысць юных талентаў і развіцця харэаграфічнага мастацтва Беларусі.




Старшыня журы Святлана Гуткоўская з удзельнікамі конкурсу